УДК 808.26:378.3

Т.У. Жукоўская, выкладчык

# ФАРМІРАВАННЕ КАМУНІКАТЫЎНЫХ НАВЫКАЎ У СТУДЭНТАЎ І КУРСА НА МАТЭРЫЯЛЕ ТЭКСТАЎ

The article dwells upon the problem of forming communicative skills of students while working at texts of various styles and genres.

Абмен інфармацыяй – адна з найбольш унікальных праяў жыцця, якая адыгрывае істотную ролю ў адаптацыі кожнага чалавека да навакольнага асяроддзя. Інфармацыйны абмен паміж людзьмі – высока развітая частка нашага жыцця – адбываецца на падставе інтэлекту: ён, у прыватнасці, ствараецца праз мову.

Сучасныя праграмы па беларускай мове пабудаваны на аснове канцэпцыі моўнай асобы, у фарміраванні якой важнае значэнне мае камунікатыўна-дзейнасны падыход. Вызначэнне прыярытэтных мэт фарміравання камунікатыўных навыкаў у студэнтаў на матэрыяле тэкстаў прадвызначае падыход да моўнай адукацыі, сутнасць якой заключаецца ў фарміраванні высока-культурнай, інтэлектуальна развітай, творчай, камунікатыўна-актыўнай асобы з індывідуальнай свядомасцю і прадуктыўным тыпам мыслення, а таксама ў фарміраванні чалавека калектыўнага, які засяроджаны ў асноўным на аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці – на тым, што аб'ядноўвае ўсіх нас. Па сутнасці, акцэнтацыя ўвагі робіцца на этыка-маўленчае камунікатыўнае ядро студэнта, якое ўключае ў сябе маўленча-камунікатыўная здольнасці, а таксама «характэрнае для яго адзінства адлюстравання адносін і паводзін, што праяўляюцца пры ўзаемадзеянні з рознымі людзьмі і супольнасцямі, з якімі індывіду даводзіцца ўступаць у прамыя ці апасродкаваныя ...кантакты» (Бодалев А.А. О коммуникативном ядре личности. – М., 1995).

Камунікатыўна-дзейнасны падыход не адмаўляе асэнсаванне мовы як сістэмы, аднак на першы план выступае агульная камунікатыўная накіраванасць на канчатковы вынік фарміравання моўнай асобы, здольнай успрымаць звязныя выказванні іншых і ствараць свае, аптымальныя па моўнай структуры, паўнаце і дакладнасці выкладання тэмы ў адпаведнасці з моўнай сітуацыяй.

Аналіз тэкстаў толькі з мэтай выяўлення лінгвістычных ведаў ужо не можа задавальняць моўную падрыхтоўку сённяшніх студэнтаў. Неабходна лічыцца з тым, што чалавек выказвае думку ў адпаведнасці са сваімі моўнымі здольнасцямі, жыццёвымі інтарэсамі, бытавымі патрэбамі, інтэлектам, эмацыянальным светаўспрыманнем падзей і тым самым дэманструе перад іншымі самога сябе: свой маральны вопыт, ідэалы, жаданні, імкненні.

Даказана, што самым надзейным паказчыкам дасведчанасці чалавека ў той ці іншай галіне навукі ці практыкі з'яўляецца яго ўласнае выказванне. Таму менавіта **выказванне лічаць вышэйшым этапам свядомай маўленчай дзейнасці асобы**. Увага павінна засяроджвацца на выпрацоўцы ўмення ўспрымаць тэкставую і моўную семантыку. А гэта азначае, што ў цэнтры ўвагі – студэнт і тэкст, маўленчыя і інтэлектуальныя здольнасці кожнага канкрэтнага чалавека, без якіх нельга ўспрымаць тэксты іншых аўтараў і ствараць уласныя.

Фарміраванне камунікатыўных навыкаў ажыццяўляецца наступнымі шляхамі: праз усведамленне паняцця пра тэкст, стылі і тыпы маўлення, жанры звязных выказванняў, праз напісанне сачыненняў, пераказаў, перакладаў і іншых відаў творчых прац, пры якіх узбагачаецца і актывізуецца слоўнік студэнта, удасканальваюцца практычныя навыкі пабудовы звязных вусных і пісьмовых тэкстаў, а таксама праз разуменне інфармацыйнай насычанасці тэкстаў.

Сапраўды, усе мы жывём у свеце тэкстаў: чытаем газеты, часопісы, кнігі слухаем радыё, глядзім тэлевізійныя перадачы, самі пішам і гаворым. І ўвесь час маем справу з тэкстам як **вышэйшай адзінкай маўлення**. Таму навучыць студэнта разумець і кваліфікавана

рэалізаваць веды, закладзеныя ў тэксце, самастойна ствараць некаторыя найбольш распаўсюджаныя і актуальныя для маўленчай практыкі віды тэкстаў з'яўляецца адной з важнейшых задач навучання.

Працэсы перадачы інфармацыі сродкамі мовы атрымалі назву **камунікацыі**. Працэсам і вынікам маўленчай дзейнасці студэнта з'яўляюцца выказванні і тэксты, у якіх фіксуюцца **спосабы афармлення думкі, яе прадметна-сэнсавая, структурна-моўная і камунікатыўная цэласнасць.** Для таго каб самастойна канструяваць выказванні, выкладчык павінен навучыць аналізаваць спосабы фарміравання чужых думак, зафіксаваных у разнастайных тэкстах, якія, як правіла, адлюстроўваюць вусную і пісьмовую формы маўлення, гутарковыя і кніжныя стылі, дыялогі і маналогі як формы моўных зносін.

Увогуле ж задача камунікацыі заключаецца ў тым, каб у свядомасці слухача ўзнікла такая ж інфармацыя, якую перадае той, хто гаворыць. Практычна атрымліваецца так, што паміж інфармацыяй перададзенай і інфармацыяй успрынятай, усталёўваецца пэўнае падабенства. І чым яно большае, тым лепш ажыццяўляюцца камунікатыўныя задачы.

Як вядома, маўленне – гэта функцыянаванне мовы, ужыванне яе людзьмі ў працэсе зносін, камунікацыі, гэта арганізаваны па законах мовы паслядоўны ланцуг моўных адзінак, які служыць для перадачы пэўнага зместу. Для таго каб быць зразумелым, студэнт **вымушаны выбіраць такія варыянты маўлення, якія з'яўляюцца агульнымі для яго маўленчага вопыту і маўленчага вопыту адрасата.** У іншым выпадку інфармацыя не дойдзе да слухача і моўныя зносіны (камунікацыя) не адбудуцца. У паляпшэнні камунікатыўных навыкаў у студэнтаў важную ролю выконваюць камунікатыўныя якасці маўлення – **правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, выразнасць і багацце (разнастайнасць) слоўнікавага запасу.** Набытыя праз навучанне камунікатыўныя якасці надаюць адаптацыі студэнта дадатковую гнуткасць. Дзякуючы гэтай здольнасці ён можа хутка мяняць формы сваёй моўнай дзейнасці і паводзін, каб адэкватна суадносіць іх з разнастайнымі ўмовамі асяроддзя.

Вызначыўшы характар маўлення як факт індывідуальнага, канкрэтнага ўжывання мовы, спынімся на асаблівасцях тэксту. Акрамя сродкаў мастацкага выяўлення вобразу, кампазіцыйных прыёмаў, лагічнай паслядоўнасці зместу, бездакорнасці мовы, выкарыстаных у тэксце, важнае значэнне мае **інфармацыйнасць, або змястоўнасць, тэксту** (тэкст ствараецца не для таго, каб ужываць пэўныя словы і сінтаксічныя канструкцыі, а для перадачы думак, зместу).

Няма сумненняў, што змястоўны тэкст, у якім пададзены глыбока і ўсебакова асэнсаваны багаты матэрыял, з'явіцца моцным стымулам для студэнта ў далейшых маўленчых дзеяннях, у развіцці самасвядомасці, пашырэнні светапогляду. Веды, набытыя студэнтам з тэкстаў, з цягам часу правяраюцца на практыцы, выкарыстоўваюцца ў паўсядзённым жыцці, такім чынам закладваецца грунт для ўспрымання свету па-за межамі універсітэцкіх сцен, ажыццяўляецца ідэйна-палітычнае, маральнае і эстэтычнае выхаванне.

І таму вельмі важным момантам у метадычнай працы выкладчыка павінен быць мэтанакіраваны падбор тэкстаў, іх педагагічная апрацоўка, аб'яднанне ў сістэмы, арганізацыя працы над тэкстамі сваіх і чужых вусных і пісьмовых выказванняў розных стыляў і жанраў.

Пры арганізацыі працы над тэкстам неабходна улічваць усе бакі развіцця маўлення студэнта: стварэнне маўленчых сітуацый і маўленчага асяроддзя, слоўнікавую работу, практыкаванні на засваенне нормаў беларускай літаратурнай мовы, на ўзбагачэнне маўлення студэнта сінанімічнымі сродкамі з мэтай іх выбару для перадачы таго ці іншага зместу з улікам абставін выказвання, сінтаксічныя практыкаванні, працу з тэкстам у непарыўнай сувязі з інтанацыяй, рэдагаваннем і ўвогуле з патрабаваннямі культуры маўлення і стылістыкі.

Зыходзячы з таго, што тэкст служыць узорам і стымулам для пабудовы самастойнага выказвання, вынік працы над тэкстам залежыць ад фармулёўкі змястоўна-маўленчых за-

данняў да яго, якія падзяляюцца на наступныя віды:

– **рэпрадукцыйныя** (накіраваны на частковае, выбарачнае ці поўнае ўзнаўленне зместу тэксту або асобных фактаў, выкладзеных у ім);

– **аналітычныя** (патрабуюць нешта растлумачыць, абгрунтаваць, выявіць прычыны, умовы таго, пра што паведамляецца ў тэксце);

– **ацэначныя** (пабуджаюць выявіць сваё стаўленне да таго, пра што паведамляецца);

– **творчыя,** у адпаведнасці з якімі ў сваіх самастойных выказваннях наконт тэксту студэнт пашырае і дадумвае сітуацыі.

Да вельмі важных фактараў развіцця маўлення належаць тыпы практыкаванняў, пераходных ад аналізу падрыхтаванага маўленчага матэрыялу да стварэння ўласных выказванняў. Такімі з'яўляюцца:

**I. Аналіз падрыхтаванага (гатовага) матэрыялу:**

1. Праца над спецыяльна складзенымі пытаннямі і заданнямі.
2. Выдзяленне (распазнаванне) і характарыстыка (разбор) патрэбных элементаў.
3. Параўнанне (супастаўленне) тых ці іншых асаблівасцей або праяў-ленняў маўлення.
4. Аналіз тэксту паводле суадноснасці моўных сродкаў з задачамі, умовамі, зместам выказвання.

**II. Пераўтварэнне моўнага (маўленчага) матэрыялу:**

1. Моўны (стылістычны) эксперымент.
2. Сінанімічныя замены.
3. Пабудова выказвання на аснове апорных элементаў, мадэляў, схем.
4. Развіццё матэрыялу да ўзроўню тэксту.
5. Рэдагаванне.

**III. Стварэнне выказвання:**

1. Выбар моўных сродкаў і тыпу маўлення.
2. Канструяванне.
3. Падрыхтоўка планаў у адпаведнасці з тэмай, стылем.
4. Сачыненне на прапанаваную ці самастойна сфармуляваную тэму ў пэўным стылі.

Як бачым, працэс фарміравання камунікатыўных (маўленчых) навыкаў павінен ажыццяўляцца ў актыўных формах навучання. Паўнацэнны навучальны працэс немагчымы без пастаяннага абнаўлення, папаўнення дыдактычнага матэрыялу, тэкстаў, якія змяшчаюць у сабе сістэму каштоўнасцяў, поглядаў, маральных прынцыпаў і дапамагаюць ствараць інтэгральныя якасці асобы, без чаго чалавек не можа рэалізаваць сваю гуманістычную грамадскую сутнасць і самарэалізавацца як індывідуальнасць.

## ЛІТАРАТУРА


1. Абабурка М.В. Культура беларускай мовы. – Мн.: Выш. шк., 1994.
2. Бодалев А.А. О коммуникативном ядре личности. – М., 1979.
3. Говард М. Сучасная культурная антрапалогія. – Мн.: Тэхналогія, 1995.
4. Каўрус А.А. Культура слова. – Мн., 1983.
5. Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы.– Мн., 1992.
6. Лепешаў І.Я. Моўныя самацветы. – Мн., 1985.